погляд, у тым, каб выкарыстоўваць у навучанні такія прынцыпы, якія склаліся ў самой народнай музыцы.

Карацееў А.Л.,
канд.мастацтвазнаўства,
дацэнт

## СІСТЭМНА-КОМПЛЕКСНАЕ ЗБАЛАНСАВАННЕ СПЕЦЫЯЛЬНЫХ ДЫСЦЫПЛІН ЯК ВАЖНАЯ ЎМОВА ПЕРАЕМНАСЦІ ДВУХУЗРОЎНЕВАГА ПРАЦЭСУ НАВУЧАННЯ ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ КУЛЬТУРЫ

(музычныя спецыялізацыі)

Праблема збалансаванасці спецдысцыплін на факультэце мастацкай творчасці павінна вырашацца ў двух напрамках: 1) паэтапнасць і прапарцыянальнасць выкладання дысцыплін на выпускаючых кафедрах; 2) абавязковая арыентацыя на пытанні пераемнасці ўсіх спецыяльных дысцыплін выпускаючых кафедраў і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў.

Для забеспячэння двухузроўневай вышэйшай адукацыі на выпускаючых кафедрах неабходна, на наш погляд, выканаць шэраг дапрацовак у межах новых навучальных планаў падрыхтоўкі бакалаўраў і магістраў, прадстаўленых у дэканат.

1. Так, на кафедры духавой музыкі практычныя заняткі па інструментоўцы трэба працягваць да канца навучання студэнтаў, таму што выпускнікі на дзяржэкзаменах абавязаны прадставіць уласныя інструментоўкі на вялікі змешаны састаў духавога аркестра. Неабходнае расканцэнтраванне па адной гадзіне ў семестры ў цяперашнім плане можна зрабіць без парушэння патыднёвай нагрузкі студэнтаў. А на гадзіны, што вызваліліся (па дзве гадзіны ў 1 і П семестрах), паставіць заняткі па інструментальнаму ансамблю, якія ў плане прадугледжаны пасярэдзіне тэрміну навучання. Такія змяненні дазволяць забяспечыць студэнтам канцэнтраваную падрыхтоўку па развіцці навыкаў ансамблевага музіцыравання, што, у сваю чаргу, забяспечыць высокі ўзровень сумеснага выканання ў аркестравым класе. Адзначым, што дысцыпліну "Стылізацыя асаблівасцей выканання сучаснай і беларускай народнай музыкі" можна ўключыць у план падрыхтоўкі магістраў.

II. На кафедры эстраднай музыкі рана для вывучэння студэнтамі пастаўлены дысцыпліны "Аркестравая літаратура" (III семестр), "Рэжысура эстраднага нумара" (1У семестр). Гэтыя дысцыпліны больш лагічна вывучаць пасля курса "Методыка работы з аркестрам", з якім іх павінна звязваць сістэмна-комплекснае спалучэнне. У гэтым выпадку навучэнцы ўжо дастаткова авалодаюць тэхналагічнымі момантамі практычнай работы з аркестрам. Мэтазгодна пашырыць змест курса "Методыка работы з аркестрам" за кошт уключэння пытанняў, што тычацца методыкі работы з ансамблямі. Аналагічнае пашырэнне было б апраўданым і для курса "Аркестравая літаратура" за кошт уключэння пытанняў па аналізе рэпертуару для ансамблевых саставаў. Акрамя гэтага, мэтазгодным было б уключэнне ў план такой дысцыпліны, як "Гісторыя эстраднага і джазавага выканання", а для плана па падрыхтоўцы магістраў - "Методыка выкладання дырыжыравання" (аркестрантам).

III. Планы кафедры народна-інструментальнай творчасці - самыя ўдалыя на факультэце і не патрабуюць асаблівых карэкціровак.

1У. На кафедры харавога мастацтва курс "Харавая літаратура" больш лагічна было б назваць "Нацыянальная і сусветная харавая літаратура". Па зместу матэрыял структурна чаргаваўся б па раздзелах, а беларускі раздзел завяршаў бы навучанне студэнтаў, якія маглі б да гэтага часу мець уяўленне аб шырокай панараме сусветнай харавой літаратуры (у плане беларускі матэрыял пазначаны ў У семестры, а за ім размяшчаецца астатні). Змяненні павінны закрануць і дысцыпліну "Дырыжорска-харавая практыка", якая можа вывучацца студэнтамі ўжо з другога курса, а не з трэцяга, як указана ў плане (варыянт для гэтага ёсць: дысцыпліну "Гісторыя і тэорыя харавога мастацтва" перанесці на УП-УШ семестры). Згодна з новым планам даволі доўга студэнтам давядзецца чакаць і набыцця ведаў па харавой аранжыроўцы. Вывучэнне гэтай дысцыпліны запланавана з У1 семестра (не можна і трэба ставіць значна раней, прычым гэтаму не перашкаджае патыднёвая нагрузка студэнтаў спецыялізацыі: 14-16 гадзін).

У. Свае рэзервы па сістэмна-комплексным збалансаванні дысцыплін ёсць і на кафедры беларускай народнапесеннай творчасці. Так, дысцыпліну "Фальклорны ансамбль", матэрыял

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якой дазваляе фарміраваць і развіваць навыкі сумеснага музіцыравання, можна вывучаць хаця б у ІЦ і 1У семестрах, але ні ў якім выпадку не пакідаць на УП і УІІІ семестры, як гэта прадугледжана ў плане (студэнты ж з 1 семестра ўжо займаюцца ў харавым класе!). Трэба было б падумаць і аб вывучэнні хаця б на другім курсе, як гэта мае месца ў аркестрантаў, дысцыплін "Расшыфроўка беларускіх народных песень" і "Аранжыроўка беларускіх народных песень", якія па плану ідуць толькі ў У1 семестры.

У1. Разгляд праблемы двухузроўневага навучання дазволіў нам прыйсці да наступных прапаноў аб пераемнасці ў навучанні бакалаўраў і магістраў.

1. Каб кардынальным чынам не ламаць навучальныя планы, якія сфарміраваліся, адысці ад аднаўзроўневай вышэйшай адукацыі, падрыхтоўку спецыялістаў з дыпломам бакалаўра можна ажыццяўляць на працягу васьмі семестраў. Галоўная задача ў навучанні студэнтаў па спецыяльных дысцыплінах павінна звесціся да развіцця індывідуальна-выканальніцкіх прафесійных якасцей, навыкаў ансамблевага музіцыравання, аркестравага (харавога) выканання - аркестравыя (харавыя) партыі, сольныя фрагменты твораў або сола ў суправаджэнні калектыву. У прынцыпе гэтыя ж пытанні, але на парадак ніжэй і ў меншай ступені цяжкасці вырашаюцца ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах. Таму, на наш погляд, быў бы рэзон выпускнікам гэтых устаноў па аналагу з замежным вопытам прысвойваць прафесійную ступень бакалаўра, а ў нашай навучальнай установе - ніжэйшую навуковую ступень бакалаўра. Для гэтага па аднаму з курсаў блока музычнатэарэтычных і спецыяльных дысцыплін выпускнік павінен напісаць і публічна абараніць адпаведную дыпломную работу.

2. На пятым годзе навучання ў ВНУ бакалаўры рыхтаваліся б да абароны дыплома на наступную вучоную ступень, ступень магістра. Галоўнай задачай навукова-даследчай і творча-выканальніцкай падрыхтоўкі такіх спецыялістаў было б фарміраванне мастацка-аналітычнага мыслення. Іх навучанне можа ажыццяўляцца па аналагу асістэнтуры-стажыроўкі: блок агульнанавуковых дысцыплін; блок спецдысцыплін; спецкурсы; падрыхтоўка дыпломнай работы (нават пры творчым паказе неабходна напісаць і абараніць дыплом, як гэта практыкавалася на факультэце ваенных дырыжораў Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі).

Бураўкін А.Г.,
канд.тэхн.навук, дацэнт
Зязюля А.Р.,
ст.выкладчык
Каленька Р.Р.,
канд.мастацтвазнаўства,дацэнт
Кульша В.М., ст.выкладчык
Шылкіна А.М., выкладчык
Шчасная Л.С., выкладчык

## ЭЛЕМЕНТЫ КАНСТРУЯВАННЯ МАСТАЦКІХ ТВОРАЎ НА АСНОВЕ КАМП'ЮТЭРНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ

Узаемадзеянне мастацтва з дакладнымі ведамі прывяло да ўзнікнення новых тэхналагічных сродкаў увасаблення мастацкіх твораў (камп'ютэрная музыка, камп'ютэрная графіка).

Ужыванне сістэмных і камп'ютэрных сродкаў падтрымкі мастацкай творчасці спрыяе свядомаму засваенню ведаў аб мастацтве. Сістэмныя і камп'ютэрныя мадэлі мастацкіх твораў адлюстроўваюць гэтыя веды ў выглядзе канструкцыі з дакладнай многаўзроўневай структурай. Гэта дазваляе не толькі ўсвядоміць унутраную структуру твора (канструкцыі), але і ствараць (канструяваць) новыя творы ў межах і на аснове агульнай тэхналогіі з улікам узаемадзеяння новай канструкцыі з навакольным светам.

Распрацоўка элементаў сістэм канструявання мастацкіх твораў вядзецца зараз па напрамках:

- мадэліраванне кампанавання плоскіх каляровых геаметрычных вобразаў;
- мадэліраванне геаметрычнага малюнка танца;
- канструяванне музычных тэкстаў.

Ровіна Р.А.,
канд.пед.навук,
дацэнт

## БЕСПЕРАПЫННАЯ ПАДРЫХТОЎКА БІБЛІЯТЭКАРАЎ ВА ЎМОВАХ УНІВЕРСІТЭТА

1. Неабходнасць удасканалення бібліятэчна-бібліяграфічнай адукацыі, якая перажывае сур'ёзныя цяжкасці, звязаныя з сацыяльна-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ